# “КАБ ЛЮБІЦЬ БЕЛАРУСЬ НАШУ РОДНУЮ, ТРЭБА Ў РОЗНЫХ КРАЯХ ПАБЫВАЦЬ…”



У межах акцыі “Жыву ў Беларусі, тым і ганаруся” вучні нашай школы з 2 “А”, 4 “А” і 4 “Б” класаў разам з настаўнікамі Анішчанка Т.С., Змушко А.І., Рэвінай В.А. адправіліся ў падарожжа. Каб лепш даведацца пра сваю краіну, дзеці пабывалі ў такіх цудоўных куточках Беларусі, як Мір і Нясвіж.





Мірскі замак і Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс сталі адкрыццем для маленькіх жыхароў Магілева. Яны засталіся ў захапленні ад убачанага і пачутага.



Толькі дакрануўшыся да гісторыі, да вытокаў мінулага можна выхаваць сапраўднае пачуцце патрыятызму і любоў да Радзімы, да роднай мовы.

